№ 120 (472)

Чацвер, 9 ліпеня 1998 г.
Выдаецца 3 ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў
у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 3000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадо...

Якуб Колас

Сонца	Усход	Заход
Віцебск	4.20	21.43
Магілёў	4.28	21.34
Гомель	4.33	21.23
Мінск	4.38	21.45
Гродна	4.55	21.59
Брэст	5.06	21.51

Сярэдні беларус, які зарабляе сёння (паводле рэальнага валютнага курсу) 50–60 долараў у месяц, са зразумелымі захапленнем і зайздрасцю марыць пра заробак сярэдняга амерыканца — 3–4 тысячы долараў у месяц

Дайджест

"Индепендент" (Великобритания):

Лукашенко выгоняет и российского посла

"Белоруссия подтвердила свою репутацию несовершеннолетнего хулигана Восточной Европы, выгнав из резиденции посла единственной страны, которую может считать единственным другом и союзником — России.

Российские официальные лица подтвердили, что посол Валерий Лощилин покинул свое жилье в уютном дипломатическом городке, ставшем ареной печально известной "канализационной войны".

Несмотря ни на что Россия решила не отзывать своего посла. Однако отношения Минска и Москвы, основанные на общности языка и советского прошлого и на тесных экономических связях, были поставлены под удар подвигами Лукашенко".

Комментарий

Беларусь и похлеще "отмочит", Россия еще и не то стерпит

Любопытна вышеприведенная выдержка из английского издания, потому что в ней представлена точка зрения просвещенной воспитанной Европы на российско-белорусские отношения на нынешнем витке. Эта точка зрения основана на понятиях нравственности и чести. Пока через мировые каналы информации в Минск прибыл дайджест из "Индепендент", много чего еще произошло, но по обычаям того псевдославянского панибратства, которое установилось между союзными державами в последние годы.

Выдворенный из Дроздов вместе с западными послами столь же унизительным манером Валерий Лощилин в начале июля отбыл... как бы в отпуск. С одной стороны, дата его возвращения не определена, что похоже все же на отзыв дипломата для консультаций. С другой стороны, ему вроде даже предписано часть "отпуска" провести в Беларуси. Вот так последовательно и неуклонно, даже в самых мелких мелочах, на бытовом уровне применительно к собственному послу Россия проводит политику двойных стандартов в отношении "несовершеннолетнего хулигана Восточной Европы".

Дальнейший ход событий, взаимосвязанных с "канализационной войной", еще убедительнее доказывает, что Россия-матушка от скандального союзника готова все стерпеть. Нарвавшись на обструкцию в Кран-Монтано, президент Александр Лукашенко припозорил заодно с прочими и Россию, заявив, что, дескать, для вступления в Совет Европы "нужно просто расстрелять парламент танками". МИД со Смоленской площади в Москве прислал ноту: как, мол, вас понимать, что это за "непристойный выпад"?

Впрочем, у высокопоставленных россиян и белорусов это — дело житейское: у них, что называется, рука руку моет. Никакая мораль, никакая этика, никакие протоколы, никакие политесы не могут быть важнее экономических, энергетических, транзитных, финансовых взаимозависимостей. Зато чуть чего союзники дружно обличают в использовании двойных стандартов по отношению к себе своих общих западных "противников".

Минск не удосужился дать официальный ответ на ноту о недружественной выходке в Кран-Монтано главе внешнеполитического ведомства господину Евгению Примакову. Москва послала своих ходатаев в Парламентскую ассамблею ОБСЕ, чтобы помочь белорусам легализовать там назначенный президентом карманный парламент.

Все это, вероятно, очень трудно усваивается британским джентльменским сознанием, базирующемся на понятии высокого престижа своей страны в глазах мирового сообщества.

Людмила МАСЛЮКОВА,
политический обозреватель "Народной воли".

Беспредел

Мальчишки и девчонки отстаивают свое право учиться на белорусском языке

Ученики гуманитарного лицея 7 июля вновь стали в пикет на ближайшем от учебного заведения оживленном перекрестке. В течение недели белорусские мальчишки и девчонки в центре Минска собирают подписи горожан и гостей столицы под обращением в поддержку своей борьбы за право учиться на белорусском языке.

Второй год продолжается эта неравная борьба. Ведь на находящуюся в центре города недвижимость положило глаз Управление делами президента. Само здание уже "прихватизировано", осталось выселить учащихся.

Столь важное дело поручено нынешнему "духовному отцу" белорусской нации — заместителю главы правительства Владимиру Заметалину. Полковник испробовал уже многие способы изгнания: выселение, переселение, объединение, разъединение и т.д. Но юные белорусы не сдаются. С плакатом "Руки прочь от лицея" они и стали в пикет.

Интересен плакат с оценками знаний, поставленными лицеистами "ученику" Заметалину: история Беларуси — 2; белорусский язык — 2; белорусская литература — 2; природоведение — 2; риторика — 3.

Молодежь готова и к более решительным действиям в защиту своего конституционного права выбора языка обучения. Однако юношеские порывы сдерживают родители и преподаватели. Они надеются, что власти все же одумаются. Дети верят взрослым. Пока верят. Но что ребята будут делать, если веру в справедливость президентская вертикаль уничтожит?

Валерий ЩУКИН.

Зварот

Мы хочам вучыцца толькі ў сваіх выкладчыкаў

Мы, вучні Беларускага гуманітарнага ліцэя, сталі ў гэты пікет, каб абараніць свае права на адукацыю. Згодна з праектам, які падрыхтаваны ў Савеце міністраў Рэспублікі Беларусь, наш ліцэй хочуць "рэарганізаваць", змяніўшы настаўнікаў і кіраўніцтва. З гэтай мэтай плануецца стварыць ліквідацыйную камісію. Але мы хочам вучыцца ў нашых любімых выкладчыкаў, у нашым адзіным ва ўсім свеце цалкам беларускамоўным ліцэі. Мы вытрымалі вялікі конкурс, каб паступіць менавіта сюды, а зараз, калі гэтая падрыхтаваная таемна ад нас і нашых бацькоў "рэарганізацыя" адбудзецца, ліцэй страціць сваё аблічча, а фактычна — знікне.

Мы ўпэўнены — гэта будзе гвалт. Гвалт над намі, дзецьмі. Над нашай марай стаць грамадзянамі Беларусі, якімі Бацькаўшчына ў будучыні зможа ганарыцца.

Мы заклікаем Вас, шаноўны сябра, падтрымаць нашае змаганне. Бацькі заўсёды дапамагаюць сваім дзецям, бо хто яшчэ ім дапаможа? Гэтаму Вы самі нас вучылі.

Мы звяртаемся да Вас, кожны шаноўны спадар ці спадарыня! Вы можаце падтрымаць нас сваім подпісам пад нашым зваротам. Вы можаце расказаць пра нашую праблему сваім родным і знаёмым. Нарэшце, Вы можаце стаць побач з намі ў пікет.

Разам мы пераможам!

Вялікі дзякуй Вам за падтрымку.

Вучні 1—4 курсаў Беларускага гуманітарнага ліцэя.

Парламентская ассамблея ОБСЕ еще раз подтвердила свой выбор в пользу законно избранного Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва

В эти дни в Копенгагене проходит очередное заседание Парламентской ассамблеи ОБСЕ, в котором принимает участие делегация Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва в составе С.Шарецкого, А.Лебедько, В.Нистюка.

При активной поддержке российской Госдумы нынешний так называемый парламент — Национальное собрание — предпринял попытку оспорить полномочия делегации законно избранного Верховного Совета. В этой связи 6 июля состоялось заседание мандатной комиссии, на котором выступили депутаты Верховного Совета В.Нистюк, А.Лебедько, а также, им в противовес, представитель президента "палатник" В.Коноплев.

7 июля 1998 года после дискуссии, в которой приняли участие руководители парламентских делегаций (от Беларуси — председатель Верховного Совета С.Шарецкий), Постоянный комитет Парламентской ассамблеи ОБСЕ вынес окончательный вердикт: полномочна делегация Верховного Совета 13-го созыва. Только руководители двух делегаций — России и Казахстана — проголосовали "за" замену делегации Верховного Совета на представителей Нацсобрания, но остались в абсолютном меньшинстве.

Таким образом, международное сообщество в очередной раз подтвердило свою приверженность принципам демократии, законности и парламентаризма.

Людмила ВАЛЕНТИНОВА.

Суд Партызанскага раёна Мінска маўчыць, як партызан на допыце

Днямі Генадзь Карпенка знайшоў у сваёй паштовай скрынцы ліст з суда Партызанскага раёна Мінска. Паколькі менавіта ў гэты суд вядомы палітык звяртаўся па так званай "бавоўнавай справе", ён лагічна палічыў, што, можа, нарэшце прыйшоў такі чаканы ім адказ. Аднак Карпенку чакаў зусім іншы сюрпрыз.

У канверце ляжаў выканаўчы ліст, чамусьці нават у двух экземплярах за №2-985ª, у якім паведамлялася, што суд вырашыў спагнаць з рэдакцыі "Газеты Андрея Климова" на карысць Карпенкі 10 мільёнаў рублёў. Гэтыя грошы — кампенсацыя за маральны ўрон, які атрымаў віцэ-спікер Вярхоўнага Савета ў сувязі з друкаваннем у "Газете Андрея Климова" артыкула "Солнечный город Молодечно". Гэты артыкул з'явіўся падчас выбарчай кампаніі ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь яшчэ ў 1995 годзе. Тады ж у суд вызвалі і тагачаснага галоўнага рэдактара газеты Міхаіла Падаляка. Той патлумачыў, што артыкул падрыхтаваў маёр Камітэта дзяржаўнай бяспекі Мікалай Кудзін, які ў той час працаваў у Маладзечне. У заяве, якую рэдактар Падаляк перадаў у суд, ён патлумачыў, што рэдакцыя не пераправярала факты. Пасля таго, як Карпенка перадаў рэдакцыі спіс дакументаў, якія абвяргаюць факты з артыкула, рэдакцыя прызнала матэрыял "Солнечный город Молодечно" неадпавядаючым сапраўднай рэчаіснасці і Падаляк ад імя рэдакцыі на судзе прынёс свае прабачэнні віцэ-спікеру.

Самае цікавае ў гэтай гісторыі тое, што суд прыняў рашэнне задаволіць іск Генадзя Карпенкі яшчэ ў лістападзе 1995 года, амаль тры гады таму. За гэты час адбылося мноства змен: "Газета Андрея Климова" спыніла свой выхад, сам Клімаў, як і Карпенка, стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета, яны апынуліся ў адной парламенцкай фракцыі "Грамадзянскае дзеянне". І таму цяпер утрымліваць грошы з калегі, які да таго ж пяты месяц сядзіць за кратамі, было б непрыстойна і брыдка, лічыць Генадзь Карпенка. І ўвогуле, уся гэтая гісторыя нагадвае нейкі недарэчны спектакль, асабліва калі ўлічыць, што ў лісце з суда паведамляецца наступнае: газета больш не існуе, былы рэдактар Падаляк выпісаўся з Мінска, дзе яго шукаць, ніхто не ведае, ніякай маёмасці праваахоўчыя органы не знайшлі. Таму выкананне так званай на мове юрыстаў "выканаўчай вытворчасці" спынена. Карпенку прапануюць альбо напісаць новую скаргу, альбо вынесці пратэст на спыненне выканаўчай вытворчасці.

Але зноў мець справу па гэтым пытанні з такім судом намеснік старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання ўжо не хоча. Хаця яму не пазайздросціш: абвяржэнне нідзе не надрукавана, Падаляк з'ехаў, а былы маёр КДБ Кудзін ужо падпалкоўнік. А час ідзе...

І ўсё ж Генадзь Карпенка напісаў ліст менавіта ў суд Партызанскага раёна, але ўжо з другой нагоды. Ён узгадаў, што яшчэ з 16 лістапада 1995 года ён падаў іск у сувязі з тым, што прэзідэнт Лукашэнка падчас свайго выступлення па тэлебачанні заявіў: я дамовіўся з прэзідэнтам Карымавым пра пастаўкі узбекскай бавоўны на Беларусь. Аднак група людзей, на чале якіх стаіць Генадзь Карпенка, перашкаджала пастаўкам узбекскай бавоўны на Беларусь.

Усе спробы абвергнуць, па словах Карпенкі, абсурднасць такога абвінавачвання не прынеслі яму ніякага поспеху. Як сумна жартуе віцэ-спікер, Партызанскі раённы суд маўчыць, як партызан на допыце. Адзіным адказам была спасылка на тое, што ў прэзідэнцкай Адміністрацыі распрацоўваецца праект Закона "Аб абароне гонару і годнасці прэзідэнта Рэспублікі Беларусь", у якім будзе вызначаны механізм прад'яўлення грамадзянскіх іскаў да кіраўніка дзяржавы. Адказ гэты, дарэчы, прыйшоў яшчэ ў снежні 1995 года. Амаль тры гады Адміністрацыя рыхтуе гэты закон. Да гэтага часу Нацыянальны сход яго яшчэ не разглядаў. І невядома, калі да гэтага дойдзе справа. Вось такая гісторыя.

Васіль ГАРБЫЛЬ.

Незалежная экспертыза

Уладзімір КУЛАЖАНКА,
доктар эканамічных навук, прафесар

Фінансавы крызіс у Беларусі і ў Расіі

Як вядома, у маі расійская фінансавая сістэма перажыла моцную хвалю фінансавага крызісу, які не пераадолены і да сённяшняга дня. Наадварот, у канцы чэрвеня ён зноў абвастрыўся.

А што ў нас? Фінансавы крызіс доўжыцца ўжо не адзін месяц.

Назіральнікі звярнулі ўвагу на агульнасць прычын фінансавага крызісу ў Расіі і Беларусі, а таксама зафіксавалі розначасць падыходаў да яго ацэнкі і форм пераадолення.

У чым гэтая агульнасць і розначасць?

Фінансавы крызіс у Расіі, які ў маі, а затым асабліва ў чэрвені стварыў напружанне ў эканоміцы краіны і ў вышэйшых эшалонах улады, спароджаны многімі прычынамі. Найперш — стагнацыяй эканомікі, калі няма ні росту, ні падзення. Па-другое, калі бюджэт у сваёй прыходнай частцы не пакрывае ўвесь аб'ём дзяржаўных расходаў, узнікае як бы непераадольны дэфіцыт. Нарэшце — страйкамі шахцёраў, іх рэйкавай вайной.

На Беларусі фінансавы крызіс мае тыя ж карані: гэта горшая форма стагнацыі вытворчасці, калі ўзрастаючы валавы аб'ём вытворчасці ўвесь ідзе на склад, дзе горы нерэалізаваных тавараў дасягнулі кошту больш за 23 трыльёны рублёў. Бюджэт на Беларусі таксама неадрэгуляваны. Дэфіцыт за год складае амаль 17 трыльёнаў рублёў і пакрываецца пры дапамозе эмісійных крэдытаў Нацбанка ды выпуску дзяржаўных каштоўных папер — так званых ДКА.

Статыстыка зафіксавала нібы рост вытворчасці, але ў маі затрыманая заработная плата павялічылася на 30 працэнтаў. Ёсць масавая незадаволенасць нізкай заработнай платай, высокімі цэнамі, якія ўвесь час растуць.

Трэцяя хваля фінансавага крызісу ў Расіі з кастрычніка 1997 года не прыцягнула б да сябе вялікай увагі з боку Беларусі, каб не тая акалічнасць, што пры цеснай інтэграцыі, найперш праз знешні гандаль, Беларусь, на жаль, усё цясней прывязваецца да эканомікі Расіі. Таму любая хваля ці форма крызісу ў Расіі абавязкова перакідваецца на Беларусь. Праўда, фінансавы крызіс у нас адчуваўся і без Расіі. Няцяжка ўявіць, што было б з беларускім рублём, каб пайшоў уніз рубель расійскі. Але Цэнтральны банк Расіі на чале з Сяргеем Дубініным і новы ўрад прынялі проста драконаўскія меры, каб не дапусціць дэвальвацыі расійскага рубля. Яны паднялі стаўку рэфінансавання аж да 150 працэнтаў. Затым знізілі яе да 60 працэнтаў, а калі ў канцы чэрвеня фінансавы крызіс абвастрыўся, то зноў паднялі яе да 80 працэнтаў. А гэта азначае, што ўзяць у банках грошы і купіць на іх долары ніхто пры такой цане крэдыту не ў стане. Вось чаму рубель толькі здрыгануўся, але ўтрымаўся на ранейшай мяжы. У дадатак да гэтага Цэнтральны банк Расіі мае значныя валютныя рэзервы, якія скіроўвае на валютны рынак, каб давесці, што расійскі рубель усё ж канверсоўная валюта. Ды і багатыя краіны абяцаюць дапамагчы. Новы прэм'ер-міністр Расіі спадар Кірыенка зрабіў апошнім часам візіт у Францыю, вядома, не толькі з азнаямляльнай мэтай. Да справы падключыўся А.Чубайс. У Маскву прыехалі прадстаўнікі Міжнароднага валютнага фонду. Заключана дамова аб прадастаўленні Расіі стабілізацыйнага крэдыту памерам 15 трыльёнаў долараў.

Між іншым, такой магчымасці і падтрымкі звонку Нацыянальны банк Беларусі не мае. Ні ўнутранай, ні знешняй.

Фінансавы крызіс на Беларусі спрабуюць патушыць не эканамічнымі, а адміністрацыйна-каманднымі метадамі, пра якія нядаўна распавёў кіраўнік Нацбанка Пётр Пракаповіч на прэс-канферэнцыі.

Пры незадаволеным попыце на валюту кіраўнік банка лічыць, што зніжэннем стаўкі рэфінансавання да 40 працэнтаў (у Расіі павышаюць, а мы зніжаем) можна ўмацаваць валютны курс беларускага рубля. І пра гэта заяўляецца на поўным сур'ёзе.

Вялікім дасягненнем новай фінансавай палітыкі Нацбанка лічыцца тое, што ў маі імпарт быў аплачаны толькі на 15,4 працэнта нацыянальнай валютай замест 19,5 працэнта ў красавіку. А вось калі аплата імпарту ў рублях знізіцца да 5 працэнтаў, тады беларускі рубель умацуецца, як ніколі. Памылковы гэта разлік. Проста не будзе чаго мацаваць, таму што рубель у разліках амаль пакіне сферу знешняга гандлю. Тым болей, што на карэспандэнцкіх рахунках нерэзідэнтаў, па разліках Нацбанка, праз колькі месяцаў застанецца толькі 300—350 мільярдаў беларускіх рублёў, хоць зараз пакуль што ёсць значныя сумы.

Разлік сённяшніх беларускіх банкіраў і іх дарадчыкаў да наіўнасці просты. На знешнім рынку рублёў амаль не будзе. Не будзе і ціску рэальнага курсу беларускага рубля, які ў Маскве зафіксаваны сёння на ўзроўні 59—64 тысяч рублёў за долар, на адміністрацыйным курсе таго ж рубля, які ўстаноўлены ў Мінску на ўзроўні 38 тысяч рублёў за долар. А што датычыцца курсу беларускага рубля ўнутры краіны, то тут ёсць разлік на выключна адміністрацыйныя метады рэгулявання. У выніку фінансы стабілізуюцца, курс беларускага рубля стане трывалым і ўсё нармалізуецца.

Такі аптымізм не мае ніякіх падстаў, бо звужэнне поля дзейнасці беларускага рубля за мяжой будзе толькі абмяжоўваць беларускі знешні гандаль. Нават цяжка ўявіць, каб Злучаныя Штаты Амерыкі пачалі скарачаць колькасць долараў за межамі краіны. Дзеля чаго гэта ім трэба? А беларускім банкірам свае грошы выцясняць са знешняга рынку, як бачыце, проста неабходна.

Але самае дзіўнае ў іншым: у Нацыянальным банку разлічваюць, што прынятыя квазіэканамічныя меры дазволяць з 1 кастрычніка ўстанавіць адзіны валютны курс у краіне ў сферы каціровак на дадатковых гандлях МВБ, на знешніх рынках і на рынку наяўнасці. Цяжка паверыць у гэта пры сённяшнім стане валютных і фінансавых стасункаў у краіне. Думаецца, што гэтая заява адрасуецца найперш Міжнароднаму валютнаму фонду, каб пераканаць яго ў аднаўленні супрацоўніцтва. Было б добра, каб там паверылі.

Кто водит за нос десять миллионов белорусов: президент Лукашенко или министр финансов Корбут?

"Последнюю копейку я отдаю, если она есть, людям, и прежде всего женщинам".

Из книги "Александр Лукашенко — президент Республики Беларусь".

Так называемое Национальное собрание приняло закон под названием "Отчет об исполнении республиканского бюджета Республики Беларусь за 1997 год". Перед обсуждением этого законопроекта каждый из "палаточников" и каждый из "сенаторов" получил объемистую книжицу, в которую вошло семьдесят страниц убористого текста. В ней можно найти все важнейшие цифры, касающиеся бюджета за 1997 год, а также пояснительную записку к ним, подписанную министром финансов Николаем Корбутом.

Во время обсуждения законопроекта никто из нынешних законодателей, а в двух палатах их полторы сотни человек, не обратил внимание на одну цифру. Возможно, потому, что она по их масштабам ничтожно мала — всего 600 тысяч рублей. Действительно, это полный мизер, поскольку рядом с этой цифрой идет счет на миллионы, миллиарды и даже триллионы белорусских рублей.

Однако цифра 600.000 крайне и крайне любопытна. Она проходит по разделу "Поступления сборов и неналоговых доходов за 1997 год" графой "Добровольные взносы физических и юридических лиц". А теперь давайте считать. Предположим, что все 600.000 внес один человек. Теперь разделим эти деньги на 12 месяцев в году. Получается, что этот человек ежемесячно добровольно отчислял в бюджет 50 тысяч рублей. А теперь вспомним обещание Александра Григорьевича Лукашенко ежемесячно перечислять в бюджет 30 процентов своей зарплаты. Сколько же получает наш президент? В мае, выступая на Съезде белорусских журналистов, Александр Григорьевич сам назвал эту цифру — порядка 13 миллионов в месяц. В прошлом году, разумеется, он получал поменьше: допустим, 10 миллионов, а может, даже и меньше. Ну, например, пять. Сравнивая две цифры, — пять миллионов и пятьдесят тысяч — убеждаемся, что он переводил в бюджет всего лишь один процент своего заработка.

Отсюда и возникает вопрос. Кто же водит нас всех за нос: президент Лукашенко или министр финансов Корбут? Если слово не держит президент, то это его не красит. Если министр финансов дал мне неправильную цифру, то это — свидетельство низкого качества его работы.

Владимир КОТ.

Прэзідыум Савета міністраў разгледзеў праект канцэпцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны да 2015 года

Чарговае пасяджэнне Прэзідыума Савета міністраў адбылося 7 ліпеня пад старшынствам прэм'ер-міністра краіны Сяргея Лінга.

Як паведаміў БелТА прэс-сакратар кіраўніка беларускага ўрада Дзмітрый Маліноўскі, на пасяджэнні быў разгледжаны праект Канцэпцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2015 года. Дакладчыкам па гэтым пытанні выступіў міністр эканомікі Уладзімір Шымаў. У ходзе дыскусіі, праведзенай канструктыўна і па-дзелавому, удзельнікі пасяджэння прыйшлі да высновы аб неабходнасці прыняцця гэтай канцэпцыі.

БелТА.

Заява прэс-сакратара дзярждэпартамента ЗША Джэймса Рубіна

Вашынгтон, 6 ліпеня 1998 г.

Урад Беларусі чарговы раз парушыў Венскую канвенцыю аб дыпламатычных зносінах. Беларускія ўлады знеслі агароджу, якой была абнесена пасольская рэзідэнцыя ў Мінску. Гэта было зроблена без усялякага дазволу альбо папярэдняга ўведамлення. Больш таго, асоба, якая назвалася прадстаўніком урада Беларусі, была заўважана падчас яе знаходжання на тэрыторыі, што з'яўляецца нашай маёмасцю.

Раней мы праінфармавалі ўрад Беларусі аб намеры ўстанавіць нашу ўласную ахову маёмасці, аднак нам было адмоўлена. Адмаўляючы нам у магчымасці ахоўваць нашу маёмасць, Беларусь узяла на сябе адказнасць па абароне яе ад несанкцыянаваных уварванняў. Цяпер беларускі рэжым абраў шлях ігнаравання прынцыпаў Венскай канвенцыі, якія не дазваляюць уваход на тэрыторыю дыпламатычнай рэзідэнцыі без дазволу.

Мы нагадваем беларускаму рэжыму, што рэзідэнцыя Главы Місіі знаходзіцца пад аховай Венскай канвенцыі. Мы чакаем, што ўрад Беларусі неадкладна адновіць знесеную агароджу, забярэ сваіх прадстаўнікоў з нашай тэрыторыі, дазволіць нам устанавіць на ёй нашу ўласную ахову і адкрые Злучаным Штатам беспераашкодны доступ да іх маёмасці.

Версии

Пять сценариев

возможного развития событий в Республике Беларусь

На сегодня, 9 июля, президент Республики Беларусь Александр Лукашенко наметил большое совещание, посвященное рассмотрению результатов работы Республиканской комиссии по изучению негативных явлений в экономике. Напомним читателям, что эта комиссия была создана в марте после грозного валютного кризиса. Тогда Александр Лукашенко поручил председателю Комитета государственного контроля Николаю Домашкевичу лично возглавить работу комиссии.

По информации, которую я получил у сотрудников Администрации президента Беларуси, правительства и других властных структур, можно предполагать, что сегодня по результатам совещания нас ждут пять возможных сценариев развития событий.

Вариант первый. Заседание превратится в дежурное мероприятие, на котором президент будет критиковать всех и вся, особенно правительство. Правда, у команды Сергея Линга есть веский аргумент в свою защиту — предварительные итоги работы за первое полугодие показывают, что все задания главы государства в области экономики выполнены. Поэтому после традиционных популистских заходов президента все будет потихоньку спущено на тормозах и глава правительства с 13 июля уйдет в очередной отпуск.

Вариант второй. Президент может всерьез раскритиковать работу Совета министров. Аргумент правительства с выполнением плановых заданий в расчет приниматься не будет, поскольку все прекрасно понимают, что при всевозможном цифровом росте ситуация в экономике крайне серьезная. Итогом заседания может стать последнее предупреждение премьеру и его министрам.

Вариант третий. Президент наконец-то удовлетворит четвертое, а по некоторым источникам и пятое заявление Сергея Линга об уходе в отставку. В таком случае Совет министров возглавит Иван Титенков. Ему в помощь в качестве первого вице-премьера перейдет нынешний министр экономики доктор наук Владимир Шимов. Предполагается также, что будут освобождены от своих должностей три министра. Иван Антонович и Михаил Маринич — за низкоэффективную работу подчиненных им ведомств. Но, пожалуй, самые крупные неприятности грозят министру здравоохранения Игорю Зеленкевичу. Проверка этого министерства, которую осуществили подчиненные Николая Домашкевича, показала множество нарушений финансового характера. По некоторым сведениям, разговор идет о сотнях тысяч долларов. Что же касается освобождающегося места управделами президента, то его планируется передать чуть ли не другу детства Александра Лукашенко Владимиру Коноплеву.

Вариант четвертый. Так называемый "кремлевский". По примеру Бориса Ельцина Александр Лукашенко отправит в отставку все правительство, поручив формирование нового кабинета то ли Ивану Титенкову, то ли Николаю Домашкевичу.

И наконец, вариант пятый, самый радикальный.

Президент отправляет в отставку все правительство и одновременно распускает Нижнюю палату Национального собрания. (Возможен вариант, что роспуск будет инициирован как бы от имени самих палаточников.) Впрочем, поводов для освобождения от Палаты представителей более чем предостаточно: заседания не отличаются высокой посещаемостью, многие больше заняты своей основной работой, чем законодательной, да и серьезных законов по большому счету Палата пока не приняла...

На мой взгляд, для президента наиболее предпочтителен последний вариант. Но вместе с тем он наименее вероятный. И никакого парадокса здесь нет — просто президенту намного удобнее воспользоваться этим ходом где-нибудь в середине осени. Это будет красивый жест и для населения, мол, как я о вас забочусь, и для оппозиции, и Запада, мол, вы хотели новые выборы — получайте их.

Владимир ГЛОД.

Надвор'е

9 і 10 ліпеня на тэрыторыі рэспублікі воблачна з праясненнямі, 9-га — па паўночна-ўсходняй палавіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы; 10-га ўначы пераважна без ападкаў, удзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць дажджы, месцамі з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы — +8...+13, удзень — +16...+21.

Рабочая солидарность

Выпуск 2

Эхо

Как уже сообщалось, недавно состоялось общереспубликанское собрание представителей трудовых коллективов и профсоюзных организаций. Предлагаем вашему вниманию выступления сопредседателей Белорусской независимой ассоциации профсоюзов промышленности Александра Бухвостова и Геннадия Федынича, которые в полной мере характеризуют ситуацию, сложившуюся в промышленности нашей республики. Итак, слово участникам собрания.

Александр БУХВОСТОВ, председатель Республиканского совета Белорусского профсоюза работников автомобильного и сельскохозяйственного машиностроения

Не упустить шанс

Сегодня мы собрались не только для того, чтобы рассказать друг другу, как плохо живем. Мы это уже давно знаем. Мы собрались, чтобы выработать и принять решения, которые бы послужили отправной точкой начала общих действий профсоюзов по защите социально-экономических интересов и прав. Наш профсоюз уже в течение нескольких лет пытается вести борьбу с правительством, нанимателями за то, чтобы росла заработная плата на предприятиях. Мы уже заключили и подписали тарифные соглашения и договоры, все же 6 апреля направили требования в адрес президента и правительства по улучшению социально-экономического положения в отрасли. Потому что подписанные тарифные соглашения и договоры (а нас практически вынудили к этому) ни в коей мере не могут удовлетворить с точки зрения оплаты труда.

Положение промышленных предприятий крайне тяжелое. Налоги, валютная политика, политика контролёров, постоянные поборы на всякие нужды (типа строительства комплекса "Олимпийский" Национального олимпийского комитета), лишение возможности заниматься нормализацией своей экономики, ограничение хозяйственной самостоятельности не дают предприятиям нормально работать. К тому же растут затраты на производство, наверное, нельзя бездумно гнать объёмы. За год планируется сорвать в бюджет с предприятий на 1,7 триллиона рублей. Правительство не заботится о рынках сбыта, обеспечении кредитами, его политика ведёт к тому, что скоро от Беларуси будут все "шарахаться". Ведь экспорт в другие страны снизился на 16%. В такой ситуации мы не видим реальных перспектив повышения зарплаты. Требуется менять ситуацию, менять политику правительства так, чтобы в 1998 году была достигнута зарплата 160—180 долларов, в 1999 году — 200—250, в 2000 — 250—300 долларов! Минимальная оплата труда на любом рабочем месте — не ниже 100% МПБ.

Правительство должно создать такие условия для работы предприятий, чтобы в ходе переговоров по ТС и КД на 1999 год мы выходили на эти цифры. Это основное наше требование. Кроме этого: ликвидация задолженности по зарплате и своевременность её выплаты, Закон о придании заработной плате статуса первоочередного платежа, Закон, защищающий право трудящимся на забастовку (сколько мы будем терпеть и работать зимой в холоде), пересмотр пенсионного обеспечения, прекратить брать налоги с компенсаций семьям погибших на производстве и пострадавших и т.д.

Правительство ответило очередной отпиской, на большее оно уже не способно. 19 мая у нас был пленум Совета профсоюза, и принято решение провести манифестации и митинги в защиту наших требований по повышению жизненного уровня. Мы видим, что социальное партнерство, о котором говорит правительство, и все — это игра в одни ворота, где голы забивают только трудящиеся. И все, что происходит, ложится на плечи рабочего человека. Надо готовить людей. У нас как сейчас? Мы говорим, что нужны переговоры, и народ думаёт, что да, может, и надо вести переговоры. Хотя в душе чувствует, что от этих переговоров — как от козла молока. Поэтому нужны активные действия. Во все времена профсоюзы, рабочие достигали результатов только на улицах, только забастовками и митингами. Это мы приучили рабочих: вы посидите, а мы пойдем там поговорим. Вот они сидят и ждут. Вы там говорите, а мы думаем: ну что же, когда же результат будет? И потом мы оказываемся виноватыми и начинаем задумываться, почему люди такие пассивные...

Люди не пассивные. У нас уже есть примеры, когда рабочие сами поднимаются на защиту своих прав. На днях кузнецы Минского подшипникового завода забастовали и потребовали повышения зарплаты. Я думаю, что у каждого зреет такое желание и надо эти желания объединить. Товарищи, нам необходимо защищать свои права. Ведь смотрите: еще с февраля 1996 года мы пытаемся попасть на телевидение. И тогда президент отчетливо сказал — дадим им рабочую трибуну. До сих пор ждем, когда же обещание президента исполнится. Профсоюзы должны иметь доступ к любым государственным СМИ — как печатным, так и электронным. [illegible] Перенос профсоюзного пикета с Октябрьской площади к Дворцу спорта — это факт пренебрежения властей интересами людей труда. Я предлагаю собранию принять заявление с протестом против нарушения в Беларуси прав профсоюзов. А заместитель председателя Мингорисполкома В.Чикин, который подписал бумагу с нарушением Закона, должен уйти в отставку.

Я хотел бы еще раз сказать. Уважаемые коллеги! Сегодня есть шанс профсоюзам выступить вместе. И давайте его реализовывать. Надо из представителей профсоюзов, которые собираются принимать участие в активных действиях, создать при Совете ФПБ штаб по подготовке и проведению акций профсоюзов в защиту социально-экономических прав трудящихся, повышения жизненного уровня. Если мы не получим конкретного ответа, будем требовать отставки правительства, думаю, к осени созреем. И я бы предложил так: профсоюзы промышленности выступают в июле, мы проводим митинг. Бюджетная сфера, учитывая их проблемы, — в августе. А в октябре подготовим людей к тому, чтобы окончательно решить: или выполняются предложения, которые прозвучали в выступлениях, или правительство, которое не может выполнять требования людей, не может работать на своих местах. Нельзя дать страху и равнодушию полностью охватить наши души. Нельзя профсоюзам сломаться и стать на колени перед властью, которая попирает законы и права трудящихся.

Генадзь ФЯДЫНІЧ, старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці

Дзіва не будзе

Не пакідае думка, што народ у сваёй большасці не ведае сапраўднага становішча ў эканоміцы дзяржавы. Мабыць, яшчэ і адгэтуль такая інфантыльнасць, такая абыякавасць, якая існуе зараз у нашых людзей.

Што ж адбываецца, на мой погляд, зараз у нас? Вы са мной можаце пагадзіцца ці не, але відавочна, што ў нас, акрамя эканамічнага крызісу, адбываецца і крызіс улады. Па-першае, і, мабыць, самае галоўнае — няздольнасць вышэйшых упраўленчых эшалонаў улады ясна, дакладна, на зразумелай усім мове сфармуляваць стратэгію развіцця, стратэгію рэформ эканомікі і палітыкі, вызначыць асноўныя арыенціры, шляхі, па якіх мы ідзём, збіраемся ісці ці павінны ісці. Замест адзінай мэтанакіраванай эканамічнай лініі, увасобленай у канкрэтных упраўленчых дзеяннях, перад намі — зігзагі і хістанні ў розныя бакі. То мы будуем рыначны сацыялізм, то — эфектыўную дзяржаву. Адсюль — атмасфера непрадказальнасці, ненадзейнасці, няўпэўненасці, у якой, як у багне, апынулася наша Беларусь і якая асуджае ўсіх нас, знаходзіцца ў зняважаным становішчы пасіўнага чакання.

Дзіва? Дзіва не будзе. Хаця, прабачце, я памыліўся. У нас ужо адно "дзіва" ёсць. Мы сваімі лічбамі па павелічэнні ўнутранага валавога прадукту спалохалі і здзівілі ўвесь сусвет. І гэтую ж рэкламу падтрымліваюць хлуслівыя сродкі дзяржаўнай інфармацыі, радыё і тэлебачанне.

Папера ўсё вытрымае. Няўжо не зразумела, што гэта ўсё хлусня? Калі я памыляюся, то раскажыце нам пра гэтае дзіва беларускай эканомікі. Як так здарылася, што мы ў Еўропе — лепшыя па паказчыку валавога ўнутранага прадукта, а людзі не могуць звесці канцы з канцамі, не могуць досыць накарміць дзяцей садавінай, агароднінай, мясам? Што заробак у многіх не дацягвае нават да рысы малазабеспячэння, што нашы рабочыя, урачы, настаўнікі, інжынеры зарабляюць столькі за месяц, колькі ў Еўропе — за дзень? Што мы купляем і спажываем ежу, якую ў Еўропе і ежай не называюць? Можа, даўно час разабрацца і з Чарнобылем? Хопіць людзей уводзіць у зман. У грамадзян ужо і так недавер да ўлады, таму голас радавога чалавека не можа быць пачуты, не можа паўплываць на ход дзяржаўных спраў. Людзі расчараваны. Ім абрыдла гэтая палітыка. Яны яе не разумеюць і не падтрымліваюць.

Не магу не сказаць яшчэ аб адным. На жаль, зніжаецца ў працоўных калектывах аўтарытэт і роля кіраўніка дзяржавы — прэзідэнта Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. Моц прэзідэнцкай улады вымяраецца зусім не колькасцю зробленых заяў ці пышнасцю правядзення святочных мерапрыемстваў, гульнёй у футбол і наведваннем універсамаў. Магчыма, гэта таксама патрэбны атрыбут прэзідэнцкай улады, але ж далёка не галоўны.

Паважаныя прадстаўнікі ўлады! Калі ў вас не хапае мужнасці паглядзець праўдзе ў вочы, не хапае розуму зразумець, што і чаму здараецца на ўсіх узроўнях улады, не хапае сіл змяніць становішча, радыкальна рэфармаваць эканоміку, дэмакратызаваць дзяржаўныя структуры, то немагчыма рухацца далей, весці размову аб дабрабыце краіны, дабрабыце народа.

Карацей кажучы, паважаныя рулявыя, трэба ісці ў адстаўку. Калі вы не зможаце летам зрабіць гэты крок самастойна, то ўвосень мы павінны дапамагчы вам зрабіць гэта. І гэта будзе не палітычны лозунг, а патрабаванне працоўных, бо такая палітыка ўрада — знявага да ўсяго працоўнага люду.

Паважаныя калегі! Я спадзяюся ў рэшце рэшт на вашу салідарнасць. Мы ўжо многа чаго страцілі. Нам больш няма чаго губляць, акрамя свайго ўрада.

В Совете Белорусской партии труда

На состоявшемся не так давно заседании Совета Белорусской партии труда был заслушан отчет исполкома БПТ о ходе выполнения решений третьего съезда БПТ. Секретарь исполкома БПТ Леонид Лемешонок отметил, что в соответствии с решением съезда создана и зарегистрирована в Госкомпечати Республики Беларусь газета "Рабочая солидарность", ответственный секретарь — Николай Герасименко. Газета выходит один раз в неделю, распространяется по партийным организациям бесплатно, выпущено редакцией 17 номеров. В отчете отмечалось также о проведении перерегистрации членов БПТ с вручением партийных билетов и партийных значков. Партийным клубам было рекомендовано завершить вручение партийных билетов и значков до ноября 1998 года, после чего провести четвертый съезд БПТ, на котором будут конкретизированы задачи в современной политической ситуации. Совет БПТ зарегистрировал созданную партийными клубами г. Минска Городскую региональную ассоциацию БПТ (председатель — Владимир Скороход) без права юридического лица. Совет БПТ обратился к профсоюзным организациям предприятий отрасли с просьбой организовывать группы поддержки БПТ гражданами, не состоящими в партии труда.

Совет партии также обсудил вопросы возможных выборов в представительные органы Республики Беларусь. Председатель БПТ Александр Бухвостов, в частности, отметил, что наиболее вероятным путём возвращения к демократии в нашем обществе являются свободные и справедливые выборы. Однако в сегодняшней ситуации участие демократических партий в выборах может повредить процессу демократизации. Ещё месяц назад Белорусская партия труда заявила о неучастии в выборах в парламент Республики Беларусь на основе Конституции 1996 года. Сегодня наше участие в выборах в Национальное собрание способствовало бы легализации режима. Наше участие в выборах зависит и от того, насколько они будут свободными и справедливыми, а это может быть только при пересмотренном положении о формировании избирательных комиссий. Это означает включение в состав комиссий представителей демократических партий, предоставление оппозиции права на пропаганду своих взглядов через средства массовой информации.

Вместе с тем мы заявляем, что примем активное участие в выборах в органы местной власти. И задача всего партактива — это подготовка к выдвижению своих кандидатов.

Исполком Белорусской партии труда.



Калектыўны дагавор — закон для прадпрыемства

Працоўны калектыў гомельскага тлушчкамбіната "застрахаваны" ад сацыяльных узрушэнняў калектыўным дагаворам, заключаным паміж адміністрацыяй і прафкамам прадпрыемства на гэты год. І цяпер дзякуючы сумесным намаганням кіраўніцтва і прафсаюзнага актыву тут пастаянна і ў поўным аб'ёме выконваюцца прынятыя дамоўленасці.

Ні ў мінулым, ні ў гэтым годзе на камбінаце не было затрымак з выплатай заработнай платы. Звыш трох мільярдаў рублёў накіравана на патанненне харчавання, праводзіліся выплаты за выслугу гадоў. За кошт прыбытку, што застаецца ў распараджэнні прадпрыемства, будуецца жыллё для работнікаў. На гэтыя мэты выдаткавана 7 мільярдаў абаротных сродкаў. Акрамя таго, 410 мільёнаў накіравана на аздараўленне працаўнікоў і іх сем'яў. Аказваюць тут матэрыяльную падтрымку і мнагадзетным сем'ям, непрацуючым пенсіянерам, ветэранам прадпрыемства.

Актыўна вядзецца на камбінаце і культурна-масавая работа. У мінулым годзе на правядзенне вечароў, іншых культурных і спартыўных мерапрыемстваў адміністрацыя пералічыла прафкаму 0,15 працэнта ад фонду заработнай платы, а ў гэтым — ужо 0,3 працэнта.

Валянціна МЕНШЫКАВА, БелТА.

Павышаны цэны на нафтапрадукты

Пастановай Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 1998 года павышаны цэны на нафтапрадукты. Суб'ектам гаспадарання Беларусі дазволена павысіць цэны на светлыя нафтапрадукты, у тым ліку і на тыя, што рэалізуюцца па фіксаваных цэнах, на 10 працэнтаў з улікам змянення ставак акцызаў у адносінах да дзеючых на 30 чэрвеня 1998 года. Стаўкі акцызаў на аўтамабільныя бензіны ўстаноўлены ў памеры ад 50 да 70 ЭКЮ за тону, дызельнае паліва — 30 ЭКЮ за тону.

Пастановай Савета міністраў Беларусі вызначаны таксама часовыя стаўкі акцызаў па падакцызных нафтапрадуктах, якія вывозяцца ў дзяржавы СНД.

Яўген ГРУБІЧ, БелаПАН.



Твое слово, правительство?

В Республиканский совет профсоюза автосельхозмашиностроения поступает немалое количество писем и обращений от работников предприятий по вопросу возмещения ущерба в соответствии с постановлением Кабинета Министров Республики Беларусь от 9 ноября 1994 года N172 "Правила возмещения вреда, причиненного жизни и здоровью гражданина". На предприятиях сложилась практика, когда наниматели на основании данного постановления самостоятельно и произвольно определяют степень вины пострадавшего на производстве и уменьшают пострадавшему или семье погибшего на производстве выплаты по возмещению ущерба; участились случаи, когда при расследовании несчастных случаев на производстве вина возлагается на пострадавшего или даже когда не возлагается на пострадавшего, ему всё равно не возмещается ущерб. Неоднократно в профсоюз обращались работники Минских тракторного, автомобильного, моторного заводов, ПО "Гомсельмаш", ОАО "Борисовский завод автотракторного электрооборудования", Белорусского автозавода и др., когда пострадавшим определена вина под давлением администрации и им уменьшены выплаты по возмещению ущерба или вообще принято решение не выплачивать. До сих пор не может решиться вопрос возмещения ущерба пострадавшим, и в том числе по возмещению ущерба детям погибшего на производстве работника треста "Белавторемстроймонтаж" Мачуги А.Г., дело которого уже год находится в производстве суда Партизанского района г.Минска.

Следует отметить, что во всех нормативных актах, принятых государственными органами в последнее время, ущемляются права рабочих, их представителей — профсоюзов, так и в "Правилах возмещения вреда, причиненного жизни и здоровью гражданина", роль профсоюзов определена как "участие в переговорах с нанимателем на стороне потерпевшего". Профсоюз автосельхозмашиностроения считает такую практику неправомерной и неоднократно предлагал правительству, чтобы вопросы возмещения ущерба пострадавшим и семьям погибших на производстве без решения профсоюзного комитета предприятия не принимались.

